ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА
«СЛУЦКАЯ РАЁННАЯ ЦЭНТРАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА»

# «Пішу як жыву”:
# да 100-годдзя з дня нараджэння Янкі Брыля



СЛУЦК 2017

Дзяржаўная ўстанова
“Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка”
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі чытачоў

# *«Пішу як жыву”*:
## *да 100-годдзя з дня нараджэння Янкі Брыля*

Рэкамендацыйны бібліяграфічны спіс

СЛУЦК, 2017



Янка Брыль (Іван Антонавіч)
(4.08.1917—25.07.2006)

“Я магу памыляцца шмат у чым, у жыцці маім было нямала меншых і большых памылак, але адно я ведаю цвёрда: вышэй за ўсё і перш за ўсё – чалавечнасць.”

*Янка Брыль*

# ПРАДМОВА

*Бібліяграфічны спіс “Пішу як жыву” знаёміць чытача з творамі пісьменніка, біяграфічнымі і крытычнымі артыкуламі пра яго.*

*Ён адрасуецца ўсім чытачам, што цікавяцца творчасцю беларускіх пісьменнікаў. Будзе бібліяграфічны спіс таксама карысны бібліятэкарам пры арганізацыі і правядзенні мерапрыемстваў. У рэкамендацыйным спісе прадстаўлена літаратура з фондаў Слуцкай раённай цэнтральнай бібліятэкі. Яна згрупавана ў двух тэматычных раздзелах, унутры раздзелаў апісанні даюцца ў алфавітным парадку аўтараў і назваў. Выдзелены два моўныя рады: на беларускай і рускай мовах.*

## Шматжанравы пісьменнік

Янка Брыль – класік нацыянальнай літаратуры. Ён – пранікнёны лірык, удумлівы празаік-аналітык, псіхолаг, мастак, які валодаў таямніцай слоўнага жывапісу, народны пісьменнік Беларусі.

Сваё пісьменніцкае прызнанне Іван Антонавіч адчуў яшчэ ў маленстве. Свой першы верш напісаў на пашы, калі яму было 9 гадоў. Янка Брыль скончыў польскую сямігадовую школу, шмат чытаў. Беларуская мова ў польскай школе выкладалася толькі для прыліку, але іменна тут захапіўся Янка роднай мовай і літаратурай: Я. Купалай, Я. Коласам, Ф. Багушэвічам. Чытаць па-руску будучага пісьменніка навучыла маці яшчэ да школы па кнігах, прывезеных з Адэсы. Асабліва моцным быў уплыў на свядомасць і творчасць будучага пісьменніка А. П. Чэхава і Л. М. Талстога, у якіх ён вучыўся "любіць мазалі і ўсё простае, праўдзівае".

А першыя свае апавяданні напісаў у 1937–1938 гг. Сярод іх і апавяданне "Марыля", якое Янка Брыль лічыў пачаткам сваёй творчай біяграфіі. Першая ж кніжка выйшла пасля вайны, у 1946 годзе, і мела назву "Апавяданні".

Гадамі творчага сталення, напружанай творчай працы сталі для пісьменніка гады Вялікай Айчыннай вайны. Творы Я. Брыля змяшчаліся ў рэспубліканскім друку і выходзілі асобнымі выданнямі. Яго пяру належаць апавяданні, аповесці, раман, эсэ, мініяцюры, нарысы, творы крытычных жанраў. І тым не менш у чытацкай свядомасці Я. Брыль існуе перш за ўсё як апавядальнік – выдатны, самабытны, прыроджаны апавядальнік. У яго творчасці звяртае на сябе ўвагу перш за ўсё высокі мастацкі ўзровень твораў. Многія творы Я. Брыля сталі хрэстаматыйнымі, у іх ліку апавяданні "Маці", "Надпіс на зрубе", "Галя".

Янка Брыль – аўтар рамана «Птушкі і гнёзды», аповесці «Ніжнія Байдуны», суаўтар кнігі «Я з вогненнай вёскі», што сталі класікай айчыннай літаратуры. Зрэшты, пісьменнік справядліва лічыўся майстрам лірычнай мініяцюры. Ён пачаў ствараць іх з сярэдзіны 1960-х гадоў і пісаў амаль да самай смерці. Але ці не галоўным творам Брыля можна лічыць аповесць «Ніжнія Байдуны». Як пісаў пісьменнік Альгерд Бахарэвіч, «Байдуны», дзе Брыль «як нідзе і ніхто да яго дае выказацца ўсім, каго далучае да народу, нагадвае працу ўтрапёнага перакладчыка.

Перакладчыка, які перастварае на мове літаратуры ледзьве не кожныя ўздых, лаянку і мармытанне, пачутыя ім некалі ў дзяцінстве і запомненыя містычным чынам на ўсё жыццё». У выніку паўстае «аўтабіяграфія, але не аўтарская, аўтабіяграфія цэлага свету, расказаная ім самім, на розныя галасы».

Пісьменнік – мастак сусветнага значэння, Янка Брыль праз выяўленне гісторыі, культуры, маралі свайго народа прапаведуе агульначалавечыя ідэалы дабра, сумленнасці, справядлівасці, прыгажосці. Беларуская проза ў яго творчасці стала больш шчырай і адкрытай, натуральнай, набыла абрысы еўрапейскага інтэлектуалізму, разняволілася ў жанравых і стылёвых адносінах.

Добра вядомы Я. Брыль і як перакладчык. На беларускую мову ім перакладзены многія творы рускіх пісьменнікаў (Л. Талстога, А. Чэхава, М. Горкага, П. Бажова, К. Паўстоўскага, Г. Траяпольскага), украінскіх (А. Вішні, А. Даўжэнкі, В. Казачэнкі), польскіх (Л. Кружкоўскага, Я. Івашкевіча, Т. Ружэвіча, М. Канановіча). Болей як 100 кніг прозы народнага пісьменніка Янкі Брыля пабачылі свет у розных краінах свету. Творы народнага пісьменніка Беларусі акрамя рускай і польскай, перакладзены яшчэ на

азербайджанскую, англійскую, албанскую, армянскую, балгарскую, венгерскую, грузінскую, іспанскую, казахскую,

кіргізскую, кітайскую, латышскую, літоўскую, малдаўскую, мангольскую, нямецкую, персідскую, румынскую, славацкую, таджыкскую, татарскую, туркменскую, узбекскую, украінскую, фінскую, французскую… Прысутнасць прозы Янкі Брыля ў кніжнай прасторы іншых краін, народаў – высокая з’ява, сведчанне сталасці беларускай нацыянальнай літаратуры.

Для Я. Брыля заўсёды самае галоўнае, самае святое – родны народ, Бацькаўшчына, роднае слова, нацыянальныя традыцыі. Для яго заўжды было надзвычай важным асэнсаваць гістарычны, маральны і эмацыянальны вопыт свайго народа. Робіць гэта ён натхнёна, грунтоўна, таленавіта, па-сыноўску шчыра, з любоўю. Сама проза Янкі Брыля сваёй шчырасцю, мудрасцю, мілагучнасцю нагадвае задушэўную песню аб Беларусі, аб нашым таленавітым народзе.

Убачанае нераўнадушнымі вачыма відавочцы і ўдзельніка падзей заўсёды ўяўляе гістарычную і эстэтычную цікавасць. Усё гэта у кнігах «Пішу як жыву», «Вячэрняе» (абедзве — 1994 год), «Дзе скарб ваш» (1997), «Сцежкі, дарожкі, прастор» (2001), «З людзьмі і самнасам» (2003), «Блакітны знiч» (2004), «Парастак» (2006) — апошнюю кнігу Янка Брыль за два тыдні да сваёй ростані з зямным светам паспеў з аўтографамі (з дапамогай дачкі, Наталлі Іванаўны Семашкевіч) разаслаць 70 сваім сябрам, калегам, блізкім, будучым чытачам і даследчыкам. Перад намі шчодрыя россыпы пісьменніцкіх назіранняў і доследаў. Часцей за ўсё гэта старонкі, прысвечаныя праблемам беларускай мовы, культуры, творчасці.

Акрамя літаратурных здольнасцей Янка Брыль меў яшчэ і арганізатарскі талент, займаўся культурнай і асветніцкай працай. У роднай вёсцы ён стварыў драматычны гурток, ставіў спектаклі і перакладаў на беларускую мову для тэатральнага рэпертуару творы рускіх і польскіх аўтараў.

У жыцці і дзейнасці многіх нашых вялікіх творцаў, пачынаючы ад Скарыны, дагэтуль разгаданы не ўсе загадкі. У Янкі Брыля таксама ёсць свая загадка, і яна, таксама сёння не разгаданая. Ненадрукаванымі і невядомымі чытачу застаюцца надзвычай аб’ёмныя дзённікі пісьменніка. Магчыма, нас яшчэ чакаюць цікавыя адкрыцці.



## *Творы*

1. Брыль, Я. Збор твораў. У 5 т. Т.1. Апавяданні / Янка Брыль. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1979. – 512 с. : [5]л. фотаіл.
2. Брыль, Я. Збор твораў. У 5 т. Т. 2. Аповесці / Янка Брыль. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1980. – 512с. : [4] л. фотаіл.
3. Брыль, Я. Збор твораў. У 5 т. Т. 3. Птушкі і гнёзды : раман ; Граніца : раздзелы з рамана ; Нарысы/ Янка Брыль. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1980. – 528с. : [4] л. фотаіл.
4. Брыль, Я. Збор твораў. У 5 т. Т. 4. Свет далёкі і блізкі : дарожныя нататкі ; Пра запаветнае : артыкулы, эсэ, партрэты / Янка Брыль. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1981. – 541с. : [4] л. фотаіл.
5. Брыль, Я. Збор твораў. У 5 т. Т. 5. Лірычныя запісы і мініяцюры/ Янка Брыль. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1981. – 591с. : [4] л. фотаіл.
6. Брыль, Я. Збор твораў. У 4 т. Т. 1. Дзе б я ні быў…: апавяданні розных гадоў ; Вясёлая падсада : апавяданні пра дзяцей / Янка Брыль. – Мінск : Беларусь, 1967. – 444с. : [3] л. фотаіл.
7. Брыль, Я. Збор твораў. У 4 т. Т.3. Птушкі і гнёзды : кніга адной маладосці / Янка Брыль. – Мінск: Беларусь, 1968. – 368с. : [4] л. фотаіл.
8. Брыль, Я. Збор твораў. У 4 т. Т. 4. Жменя сонечных промняў. Служэнне. Свет далёкі і блізкі. Думы ў дарозе / Янка Брыль. – Мінск : Беларусь, 1968. – 464с. : [4] л. фотаіл.
9. Брыль, Я. Збор твораў. У 2 т. Т.1. Аповесці. Апавяданні / Янка Брыль. – Мінск : Дзяржаўнае

выдавецтва БССР. Рэдакцыя мастацкай літаратуры, 1960. – 426с.: [1] л. партр.
10. Брыль, Я. Збор твораў. У 2 т. Т.2. Аповесці. Апавяданні. Нарысы / Янка Брыль. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1960. – 466с.
11. Брыль, Я. Выбраныя творы. У 3 т. Т. 1. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1992. – 558с.
12. Брыль, Я. Выбраныя творы. У 3 т. Т. 2. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1993. – 575с.
13. Брыль, Я. Выбраныя творы. У 3 т. Т. 3. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1993. – 654с.
14. Брыль, Я. Ад сяўбы да жніва: апавяданні / Янка Брыль. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1987. – 599с. : [1] л. партр.
15. Брыль, Я. Акраец хлеба : аповесць, апавяданні, лірычныя запісы / Янка Брыль. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1977. – 224с. : [2] л. іл. з укл., [1] л. партр.
16. Брыль, Я. Аповесці і апавяданні : для сярэд. і ст. школ. узросту / Янка Брыль; уклад. С. В. Кузьмін. – Мінск: Беларуская Савецкая Энцыклапедыя імя Пятіруся Броўкі, 1991. –383с. – (Школьная бібліятэка)
17. Брыль, Я. Вітраж : апавяданні, мініяцюры, нарысы / Янка Брыль. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1972. – 200с.
18. Брыль, Я. Вячэрняе : лірычныя запісы і мініяцюры / Янка Брыль. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1994. – 350с.
19. Брыль, Я. Дзе скарб ваш : лірычная проза / Янка Брыль. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1997. – 334с.
20. Брыль, Я. Жменя сонечных промняў. – Мінск: Беларусь, 1965. – 232с.
21. Брыль, Я. З людзьмі і сам – насам : запісы, мініяцюры, эсэ / Янка Брыль. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2003. – 334с.

22. Брыль, Я. Запаветнае : выбраныя творы / Янка Брыль ; прадм. С. Андраюка ; камент. Н. Семашкевіч. – Мінск : Беллітфонд, 1999. – 448с. : [4] л. фотаіл. – (Беларускі кнігазбор. Серыя 1. Мастацкая літаратура)
23. Брыль, Я. Муштук і папка : апавяданні, мініяцюры, маленькая сага : для сярэд. і ст. шк. узросту / Янка Брыль ; прадм. Дзмітрыя Бугаёва. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2008. – 238с. : [1] л. партр. – (Бібліятэка школьніка)
24. Брыль, Я. На сцежцы – дзеці : апавяданні, мініяцюры, эсэ / Янка Брыль. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1988. – 205с.
25. Брыль, Я. Пішу як жыву : аповесць, апавяданні, мініяцюры, эсэ / Янка Брыль. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1994. – 363с. – (Школьная бібліятэка)
26. Брыль, Я. Птушкі і гнёзды: кніга адной маладосці ; Золак, убачаны здалёк : раман, аповесць: для ст. шк. узросту / Янка Брыль. – Мінск: Ураджай, 2001. – 447с. – (Школьная бібліятэка)
27. Брыль, Я. Птушкі і гнёзды : кніга адной маладосці : раман / Янка Брыль ; прадмова Г. Шупенькі. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1989. – 352с. : [1] л. партр. – (Школьная бібліятэка)
28. Брыль, Я. Птушкі і гнёзды: кніга адной маладосці / Янка Брыль ; мастак В. А. Тарасаў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1975. – 312с. : іл. – (Беларускі раман)
29. Брыль, Я. Сцежкі, дарогі, прастор : лірычныя замалёўкі : для ст. шк. узросту / Янка Брыль; мастак Ю. Ц. Цярэшчанка. – Мінск : Юнацтва, 2001. – 238с. : іл.
30. Брыль, Я. Ты жывеш : апавяданні і мініяцюры / Янка Брыль. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1973. – 450с. : [1] л. портр.

31. Брыль, Я. Ты мой найлепшы друг : аповесці і апавяданні : для ст. шк. узросту / Янка Брыль. – Мінск : Полымя, 1998. – 446с. – (Школьная бібліятэка)
32. Брыль, Я. У сям’і : аповесці і апавяданні / Янка Брыль ; мастак І. А. Давідовіч. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1976. – 368с. : [8] л. іл.
33. Брыль, Я. Цуды ў хаціне : апавяданні : для малод. шк. узросту / Янка Брыль ; маст. М. С. Будавей. – Мінск : Юнацтва, 1998. – 111с.

***

34. Брыль, Я. Избранные произведения. В 2 т. Т. 1. Рассказы; Очерки : авториз. пер. с белорус. / Янка Брыль ; предисл. Л. Н. Новиченко ; худож. А. Томилин. – Москва : Художественная литература, 1984. – 536с. : [1] л. портр.
35. Брыль, Я. Избранные произведения. В 2 т. Т. 2. Повести; Птицы и гнезда : роман : авториз. пер. с белорус. / Янка Брыль ; худож. А. Томилин. – Москва : Художественная литература, 1984. – 560с.
36. Брыль, Я. В глухую полночь : рассказы / Янка Брыль ; авториз. пер. с бел. А. Островского ; худож. О. Шамро. – Москва : Воениздат, 1969. – 184с. : ил.
37. Брыль, Я. Витражи : миниатюры и лирические записи / Янка Брыль ; авториз. пер. с бел. Дм. Ковалева. – Минск : Мастацкая літаратура, 1974. – 272с.
38. 38.Брыль, Я. От сева до жатвы : рассказы : авториз. пер. с бел. / Янка Брыль. – Москва : Советский писатель, 1988. –544с. : [1] л. портр.
39. Брыль, Я. Повести : пер. с бел. / Янка Брыль ; худож. В. В. Красновский. – Москва : Советский писатель, 1979. – 432с. : [ 1] л. портр.
40. Брыль, Я. Под говор костра : рассказы: авториз. пер. с бел. / Янка Брыль ; предисловие А. Адамовича ;

худож. Б. Заборова. – Москва : Художественная литература, 1966. – 304с. : [ 1] л. портр.

41. Брыль, Я. Поиски слова : миниатюры и лирические записи / Янка Брыль ; авториз. пер. с бел. Д. Ковалева, Г. Попова ; худож. А. М. Кашкуревич. – Минск : Мастацкая літаратура, 1984. – 509с. : ил. , [1] л. портр.
42. Брыль, Я. Рассвет, увиденный издалека : повесть и лирические записи / Янка Брыль ; авториз. пер. с бел. Георгия Попова ; худож. Елена Муханова . – Москва : Советский писатель, 1981. –248с. : [1] л. портр.
43. Брыль, Я. Стежки, дороги, простор : пер. с бел. / Янка Брыль ; послесловие Ю. Канэ ; худож. В. Смирнов. – Москва : Издательство «Известия», 1981. – 576с. : ил. , [1] л. портр. – (Библиотека «Дружбы народов»)
44. Брыль, Я. У родника: повести : для ст. шк. возраста / Янка Брыль ; худож. Б. Б. Цитович. – Минск : Юнацтва, 1986. – 175с. : [4] л. ил., [1] л. портр. – (Библиотека юношества)
45. Адамович, А. Я из огненной деревни… /Алесь Адамович, Янка Брыль, Владимир Колесник ; авториз. пер. с бел. Д. Ковалева ; худож. И. Суслов. – Москва : Известия, 1979. – 528с. : ил. – (Библиотека “Дружбы народов”)







## *“Усё жыццё ў народзе і з народам…”*

Нарадзіўся Янка (Іван Антонавіч) Брыль 4 жніўня 1917 года ў Адэсе: бацька працаваў правадніком на чыгунцы. У 1922 годзе сям’я вярнулася ў вёску Загора (цяпер Карэліцкі раён Гродзенскай вобласці) на радзіму бацькі. Тут ва ўмовах заходнебеларускай рэчаіснасці прайшлі дзіцячыя і юначыя гады будучага пісьменніка. Ен скончыў польскую сямігадовую школу, шмат чытаў.

У 1939 годзе Я. Брыль быў прызваны ў польскую армію. Другую сусветную вайну ён сустрэў у шэрагах польскай марской пяхоты пад Гданьскам і Гдыняй. Трапіў у фашысцкі палон, уцёк з палону, дабраўся да родных мясцін. У Вялікую Айчынную вайну быў партызанам – спачатку сувязным, потым разведчыкам. Рэдагаваў падпольную партызанскую газету “Сцяг свабоды” і сатырычны антыфашысцкі лісток “Партызанскае жыгала”. Пасля вызвалення працаваў у рэдакцыях часопісаў “Вожык”, “Маладосць”, “Полымя”.



Узнагароджаны 2 ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам Айчыннай вайны II ступені, ордэнамі Дружбы народаў, Знак Пашаны, медалем Францыска Скарыны, савецкімі і польскімі медалямі, Сталінскай прэміяй (за аповесць “У Забалацці світае”), за кнігу апавяданняў, замалёвак, нарысаў "Працяг размовы" ў 1963 годзе Я. Брылю была прысуджана Літаратурная прэмія імя Я. Коласа, а ў 1982 годзе за аповесць "Золак, убачаны здалёк" - Дзяржаўная прэмія БССР . У 1981 годзе атрымаў званне народнага пісьменніка БССР.

26 верасня 2007 г. імя Янкі Брыля атрымала вуліца ў мінскім мікрараёне Міхалова. 26 жніўня 2009 г. імя Янкі Брыля было нададзена адной з вуліц г. Гдыні ў Польшчы.

### *Літаратура аб жыцці і творчасці*

1. Андраюк, С. Літаратура на мяжы стагоддзяў : колькі разважанняў пра творчасць Янкі Брыля і Васіля Быкава / Серафім Андраюк // Роднае слова. – 2003. – № 3. – С. 15–17.
2. Андраюк, С. Маці і дзеці / Серафім Андраюк // Роднае слова. – 2007. – № 8. – С. 3–5.
3. Андраюк, С. Трагічныя старонкі сямейнай сагі : аповесць “Муштук і папка” Янкі Брыля / Серафім Андраюк // Роднае слова. – 2005. – № 1. – С. 41–43.
4. Андрыевіч, В. Плён асабістых кантактаў : супрацоўніцтва Янкі Брыля з перакладчыцай Ганнай Сабецкай / Вікторыя Андрыевіч // Літаратура і мастацтва. – 2017. – 11 жн. (№ 32). – С. 10.
5. Асабістае – для грамадства // Літаратура і мастацтва. – 2017. – 4 жн. (№ 31). – С. 12.
   Архіўны фонд Янкі Брыля.
6. Асіпенка, М. Класік. Волат. Чалавек / Марыя Асіпенка // Літаратура і мастацтва. – 2017. – 11 жн. (№ 32). – С. 10.
   Пра вечарыну, прысвечаную стагоддзю Янкі Брыля ў мастацкай галерэі “Універсітэт культуры”.
7. Аскера, В. Хто бачыў партрэты Янкі Брыля? : калекцыянеры Аляксандр і Іна Радаевы паказалі твор графіка Сямёна Геруса / Вікторыя Аскера // Літаратура і мастацтва. – 2017. – 4 жн. (№ 31). – С. 14.
8. Бажок, І. Запаветная эсэістыка Янкі Брыля / Ірына Бажок // Полымя. – 2012. – № 3. – С. 123–127.
9. Брыль, Я. Мой радавод / Янка Брыль // Роднае слова. – 2005. – № 6. – С. 85–90.
10. Бугаёў, Д. Выпушчаныя на свабоду : пра публікацыю брылёўскіх мініяцюр / Дзмітрый Бугаёў // Роднае слова. – 1995. – № 8. – С. 21–24.

11. Бугаёў, Д. Служэнне Беларусі : развагі пра творчасць Янкі Брыля / Дзмітрый Бугаёў // Роднае слова. – 1997. – № 8. – С. 9–24.
12. Бугаёў, Д. Я. Служэнне Беларусі : Янка Брыль ; Спавядальнае слова майстра : яшчэ пра Янку Брыля // Бугаёў, Д. Я. Спавядальнае слова : літаратурная крытыка, успаміны / Дзмітрый Бугаёў. – Мінск, 2001. – С. 28–57.
13. Бутэвіч, А. Анатоль Бутэвіч: “Пасеянае прарасце” / Анатоль Бутэвіч; падрыхтавала Жана Капуста // Літаратура і мастацтва. – 2017. – 4 жн. (№ 31). – С. 6. Успамін пра Янку Брыля.
14. Вабішчэвіч, В. І будзе смачны хлеб духоўны : гістарычны каментар да аповесці Янкі Брыля “Сірочы хлеб” / Віктар Вабішчэвіч // Роднае слова. – 1992. – № 7-8. – С. 77–84.
15. Верціхоўская, М.І. Янка Брыль // Верціхоўская, М.І. Беларуская літаратура. Пераказ і аналіз : вучэб. дапаможнік / М. І.Верціхоўская. – Мінск, 2004.- С. 431–466.
16. Вялюгін, А. С. Янка Брыль = Янка Брыль / Анатоль Вялюгін ; пер. на рус. мову В. Я. Тараса. – Мінск : Беларусь, 1987. – 80с. : фотаіл.
17. Данілішына, А. Янка Брыль. Жыццё і творчасць : урок беларускай літаратуры (X клас) / Алена Данілішына // Роднае слова. – 2016. – № 2. – С. 50–52.
18. Жуковіч, М. Янка Брыль. Жыццё і творчасць : уступныя заняткі ў XI класе па модульнай тэхналогіі / Мікола Жуковіч // Роднае слова. – 2002. – № 8. – С. 51–53.
19. Кавальчук, Т. Л. "Цуды ў хаціне" : літаратурная гадзіна з конкурснай праграмай, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння Янкі Брыля / Кавальчук, Т. Л. //

Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа. – 2017. – № 5. – С. [63] –65.
20. Калеснік, У. А. Брыль Янка // Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік. У 6 т. Т.1. Абуховіч – Ватацы / Ін-т літ. імя Я. Купалы АН Рэспублікі Беларусь. Беларуская Энцыклапедыя ; рэдкал.: І. Э. Багдановіч [і інш.]. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 1992. – С.351–368.
21. Калеснік, У. А. Янка Брыль : нарыс жыцця і творчасці / У. А. Калеснік.- Мінск: Народная асвета, 1990.– 254с.
22. Кандратаў, М. Райскія ўспаміны Янкі Брыля / Мікола Кандратаў // Маладосць. – 2012. – № 8. – С. 117–118.
23. Канэ, Ю. М. Як паветра і хлеб : жыццевы і творчы шлях Я.Брыля / Ю. Н. Канэ. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1988.– 318с.
24. Карлюкевіч, А. Сусветнае сонца без хмар / Алесь Карлюкевіч // Літаратура і мастацтва. – 2017. – 4жн. (№ 31). – с. 11.
Пераклады кніг Я. Брыля.
25. Лебедзева, М. "Вячэрняе" Янкі Брыля як увасабленне спавядальнага жанру ў беларускай літаратуры мяжы XX - XXI стагоддзяў / Марына Лебедзева // Полымя. – 2012. – № 11. – С. 124–128.
26. Ліпаева, Т. Янка Брыль. Апавяданне "Memento mori" : урок беларускай літаратуры (X клас) / Таццяна Ліпаева // Роднае слова. - 2016. – № 2. – С. [48] –49.
27. Ліс, В. “Паэты пачынаюцца з тых дзён…”: праблема фарміравання асобы ў аповесці Янкі Брыля “Сірочы хлеб” / Вольга Ліс // Роднае слова. – 2001. – № 1. – С. 28–31.
28. Лісты Янкі Брыля да Вісарыена Гарбука / уступ. артыкул Аляксандра Вашчанкі // Полымя. – 2014. – № 9. – С. 112–121.

29. Лугоўскі, А. "...Вышэй за ўсё і перш за ўсё – чалавечнасць" : метадычныя парады па вывучэнні апавяданняў Янкі Брыля (X клас) / Аляксандр Лугоўскі // Роднае слова. – 2012. – № 7. – С. 59–62.
30. Мельнікава, З. Наймацнейшыя сярод нас… : (творчы дыялог Янкі Брыля і Уладзіміра Калесніка) / Зоя Мельнікава // Літаратура і мастацтва. – 2017. – 4 жн. (№ 31). – С. 7.
31. Мушынская, Т. “Пра шлях да святла…” : чатыры ўрокі па рамане Янкі Брыля “Птушкі і гнёзды” ў XI класе / Тамара Мушынская // Роднае слова. – 2002. – № 8. – С. 45–50.
32. Навуменка, П. “І ён – жывы” / Павел Навуменка // Літаратура і мастацтва. – 2017. – 4 жн. (№ 31). – С. 13.
Пра жыццё пісьменніка.
33. Навумчык, М. Падагульненне па раздзеле "Цікавае і захапляльнае ў звычайным, паўсядзённым" : тэставыя заданні (VII клас) / Мікалай Навумчык // Роднае слова. – 2016. – № 10. – С. 68–72.
34. Нікіфарава, В. На вяршыні досведу / Вольга Нікіфарава // Літаратура і мастацтва. – 2017. – 4 жн. (№ 31). – С. 10.
Пра мастацкі пераклад Я. Брыля.
35. Рагоўская, Н. Урокі жыцця Даніка Мальца па аповесці "Сірочы хлеб" Янкі Брыля : урок беларускай літаратуры (VII клас) / Наталля Рагоўская // Роднае слова. – 2013. – № 12. – С. 50–52.
36. Скібіцкая, Л. “Чэхаву я абавязаны вельмі многім…” : Янка Брыль пра жыццё і творчасць Антона Чэхава / Людміла Скібіцкая // Роднае слова. – 1997. – № 10. – С. 121–128.
37. Старасценка, Т. Стылістычны аналіз нарыса “Пошукі слова” Янкі Брыля / Т. Старасценка // Роднае слова. – 2010. – № 2. – С. 59–60.

38. Тычына, М. Запаветнае слова / Міхась Тычына // Літаратура і мастацтва. – 2017. – 4 жн. (№31). – С. 6.
Творчасць Янкі Брыля.
39. Украінка, С. “Быць самім сабою…” : да пытання “асоба аўтара” і “вобраз аўтара” ў мініяцюрах Янкі Брыля / Сяргей Украінка // Роднае слова. – 2002. – № 8. – С. 3–6.
40. Федарэнка, А. Вечнае жыццё ў слове / Андрэй Федарэнка // Літаратура і мастацтва. – 2017. – 4 жн.( № 31). – С. 8.
Пра Янку Брыля.
41. Шамякіна, Т. Незабыўны сусед / Таццяна Шамякіна // Літаратура і мастацтва. – 2017. – 4 жн.( № 31). – С. 12.
Пра Я. Брыля.
42. Шапран, С. "Гэта нямала – быць сапраўдным і чэсным пісьменнікам" : успамінаючы Івана Антонавіча Брыля / Сяргей Шапран // Роднае слова. – 2012. – № 8. – С. 60–63.
43. Шніп, В. Сусвет / Віктар Шніп // Літаратура і мастацтва. – 2017. – 4 жн.( № 31). – С. 8.
Сусвет Янкі Брыля.
44. Якавенка, Н. Апавяданні Янкі Брыля і Івана Навуменкі ва ўсходнеславянскай моўнай прасторы: фенаменалагічны падыход / Наталля Якавенка // Роднае слова. – 2015. – № 9. – С. 17–22.
45. Янка Брыль (1917–2006) // Навумовіч, У. А. Беларуская літаратура : вучэб. дапам. / У. А. Навумовіч. – Мінск : Вышэйшая школа, 2007. – 478с.
46. Яўхімава, М. “Усё жыццё ў народзе і з народам…” : сцэнар літаратурнай вечарыны, прысвечанай творчасці Янкі Брыля / Маргарыта Яўхімава // Роднае слова. – 1992. – № 11. – С. 54–60.

***

47. Адамович, А. Янка Брыль // Адамович, А. Собрание сочинений : В 4-х т. Т.2. Асия. Последний отпуск : повести ; Кузьма Чорный : уроки творчества, эссе ; Пулицистика и критика 50-70-х годов /Алесь Адамович. – Минск, 1982. – С. 481–512.
48. Яговдик, В. И. Золотые кросна души : штрихи к портретам / Владимир Яговдик ; пер. с бел. Вероники Марук // Неман. – 2011. – № 3. – С. 183–203.



“Пішу як жыву” : да 100-годдзя з дня нараджэння Янкі Брыля : рэкамендацыйны бібліяграфічны спіс

Складальнік: А. В. Савіч
Рэдактар: Л. В. Гурыновіч
Камп’ютарны набор: А. В. Савіч, Т. І. Стальмашонак

223610 г. Слуцк, вул. Копыльская, 2а
Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка
тэл. 5-57-72
e-mail^ biblio_slutsk@tut.by,
biblio_slutsk@mail.ru


ШКОЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА
ЯНКА БРЫЛЬ
ПТУШКІ І ГНЁЗДЫ


ЯНКА
БРЫЛЬ
У РОДНИКА


я з вогненнай вёскі...


Янка Брыль
ПАРАСТАК